УДК 882.6

І.В. Саматой

# Праблема архетыпу: філасофскі, культуралагічны, літаратуразнаўчы аспект

У сучаснай навуковай літаратуры паняцце «архетып» з'яўляецца катэгорыяй, якая шырока выкарыстоўваецца ў філасофіі, мовазнаўстве, культуралогіі, псіхалогіі і іншых навуковых дысцыплінах. Прымяненне дадзенай катэгорыі да тэарэтычнага аналізу міфалогіі ў першую чаргу звязана з працамі швейцарскага псіхааналітыка і даследчыка міфаў К.Г. Юнга. У сваіх працах ён вылучыў ідэю аб калектыўным неўсвядомленым, адпаведна якой мадэлі чалавечага вопыту не знікаюць бясследна, а, згодна феномену генетычнага кадзіравання, пераходзяць ад пакалення да пакалення. Менавіта дзякуючы гэтай сістэме сацыяльнай кадзіроўкі і існуюць архетыпы. «Правобраз, ці архетып, – піша К.Г. Юнг, – ёсць фігура, – будзь то дэмана, чалавека або з'явы, – якая паўтараецца на працягу гісторыі ўсюды, дзе павольна дзейнічае творчая фантазія. Пры падрабязным даследаванні гэтых вобразаў мы ведаем, што ў вядомым сэнсе яны з'яўляюцца сфармуляваным вынікам велізарнага тыповага вопыту безасабовага роду продкаў: гэта, так сказаць, рэшта безлічных перажыванняў аднаго і таго ж тыпу. Адлюстроўваючы мільёны індывідуальных перажыванняў, яны даюць такім шляхам адзіны вобраз псіхалагічнага жыцця, расчлянёнага і спраецыраванага на розныя персанажы міфалагічнага пандэмоніума» [1]. У кожным з гэтых вобразаў крышталізавалася частка чалавечай псіхікі і чалавечага лёсу, частка пакуты і асалоды – тых перажыванняў, якія паўтараліся ў бясконцым радзе продкаў і ў агульным заўсёды прымалі адзін і той жа ход.

Звернем увагу на тое, што адпаведна швейцарскаму вучонаму, архетыпы з'яўляюцца не вобразамі, а толькі схемамі вобразаў. Само паняцце архетып мае значэнне «першаснай схемы вобразаў, якія несвядомааднаўляюць і апрыёрна фарміруюць актыўнасць уяўлення, а таму выяўляюцца ў міфах і вераваннях, у творах літаратуры і мастацтва, у снах і непрытомных фантазіях» [2]. Як мы бачым, у сваім разуменні К.Г. Юнг некалькі адыходзіць ад этымалогіі самога слова «архетып». Апошняе ў перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы абазначае «першавобраз» (старажытнагрэчаскае αρχέτυπον – паходзіць ад αρχη – пачатак і τυρος – вобраз), менавіта ў значэнні «першавобраз», «ідэя» ўпершыню з'явілася само паняцце архетып у працах старажытнагрэчаскіх філосафаў Платона і Арыстоцеля. Першавобраз – гэта не проста вобраз, так як ён уключае ў сябе схему, ідэю, паводле якой будуюцца іншыя вобразы. «Архе, – адзначае нямецкі філосаф К. Хюбнер, – гэта гісторыя паходжання. Калісьці нейкая нумінозная істота ўпершыню здзейсніла пэўнае дзеянне, і з тых часоў гэта падзея ідэнтычна паўтараецца» [3]. Гэта дзеянне знаходзіць сваё адлюстраванне ў старажытнагрэчаскай міфалогіі як архетып, першавобраз, якім кіруюцца не толькі людзі, але і прыродныя з'явы. Натуральна, што адпаведна з такімі поглядамі архетып не можа быць вынікам чалавечай дзейнасці. Архе створана нейкай вечнай субстанцыяй (напрыклад, багамі ці платонаўскай ідэяй), а значыць яно з'яўляецца для старажытных грэкаў тым першавобразам, які нараджае нават не сабе падобныя, а поўнасцю тоесныя вобразы.

Такім чынам, К.Г. Юнг, ачысціўшы архе ад міфалагічна рэлігійнага зместу, па сутнасці пазбавіў паняцце архетып значэння вобраза, які нараджае падобныя сабе вобразы, і звёў дадзенае паняцце, галоўным чынам, да яго псіха-

лагічнага зместу, тым самым пазбавіўшы яго аб'ектыўнай анталагічнай асновы. У прымяненні да міфалогіі, такое разуменне архетыпу ператварае яе ў міфалагізаваную псіхалогію, якая, як адзначае Е.М. Меляцінскі: «...ёсць толькі гісторыя ўзаемаадносін неўсвядомленага і свядомага пачаткаў асобы, працэсу іх паступовай гарманізацыі на працягу чалавечага жыцця, пераход ад звернутай вонкі «персоны» («маскі») да вышэйшай «самасці» асобы. Акаляючы свет пры гэтым у асноўным толькі пастаўляе некаторыя рэаліі дзеля метафізічнага выражэння душэўных станаў. Нават стварэнне свету ў міфах трактуецца юнгініянцамі (напрыклад, Э. Нойманам) як гісторыя нараджэння «я», пастаянная эмансіпацыя чалавека» [4].

У адносінах да літаратуразнаўства ідэя архетыпу, вылучаная К.Г. Юнгам, мае пазітыўнае значэнне, аднак яе метафізічная абсалютызацыя можа прывесці і да негатыўных наступстваў. «Псіхааналітыка ў літаратуразнаўстве, – адзначае Г. Бутырчык, – спрыяе найглыбейшаму доследу твора, прыроды яго стварэння, суаднесенасці падзей, апісаных у ім, з біяграфіяй пісьменніка, разглядае ўплыў пэўнага твора на чытача. Разам з тым існуе небяспека змяшчэння акцэнту непасрэдна з мастацкага тэксту на асобу яго аўтара, часта ў цэнтр увагі трапляе не паэтычна літаратурны вобраз, а несвядомы чалавек, паказаны праз гэты вобраз» [5].

Да аналізу паняцця архетып у 90-я гады XX стагоддзя пачынаюць звяртацца і беларускія даследчыкі. Так, напрыклад, літаратуразнаўца У. Мархель, вылучаючы два пласты складнікаў мастацкай свядомасці, знешні і ўнутраны, сцвярджае, што апошні з названых абавязкова набліжаны да першапрычыны і зародкавых формаў, арганізуецца архетыпам. Згодна з разважаннямі К.Г. Юнга, ён лічыць архетып своеасаблівым псіхічным успрыманнем, якое атрымліваецца ў спадчыну як першабытна-калектыўны псіханабытак продкаў і менш за ўсё паддаецца змяненню пад уздзеяннем гістарычных працэсаў. У рабоце «Прысутнасць былога» У. Мархель дае наступнае азначэнне даследуемага намі паняцця: «Архетып – гэта амаль нязменная і непарушаная зададзенасць, якая ўступае ў рэалізацыю на мяжы інтуітыўнай падказкі і ва ўсякай дзейнасці чалавека, у тым ліку і ў мастацкай творчасці, выконвае ахоўную ролю, прытым на ўзроўні родавага інстынкту самазахавання» [6].

Як мы бачым, у дадзеным азначэнні няма прамога ўказання ні на калектыўна-псіхалагічную, ні на аб'ектыўна-анталагічную прыроду архетыпу. Такую недасказанасць імкнецца пераадолець У. Гніламёдаў. У сваім артыкуле «Паэтычныя традыцыі і менталітэт» ён імкнецца знайсці аб'ектыўную аснову існавання архетыпаў у сацыяльных працэсах, нормах чалавечых паводзін. Спрабуючы высветліць нацыянальнае аблічча і непаўторнасць духоўнай традыцыі беларусаў, звяртаецца да матывуючага базісу паводзін беларускага насельніцтва, да маральна-этычных імператываў, якімі чалавек кіруецца ў жыцці («Паміраеш, а жыта сей», «Не пажадай бліжняму таго, чаго не жадаеш сабе»). Аналіз гэтых імператываў прыводзіць яго да вываду, што яны з'яўляюцца маральна-этычнымі архетыпамі, а значыць, такім чынам, робіць вынік даследчык, архетып – гэта «ўстойлівая псіхічная мадэль жыццёвых працэсаў і сітуацый, якая ўтрымліваецца і захоўваецца ў чалавеку (калектыве) у сферы падсвядомага і праяўляе сябе (гэта значыць, пераходзіць у сферу свядомага) у чалавечай жыццядзейнасці, уключаючы і мастацкую творчасць» [7].

На наш погляд, дадзенае азначэнне мэтазгодна экстрапаліраваць з вобласці «праходаў і сітуацый» на сферу любых аб'ектаў як сацыяльнага, так і прыроднага паходжання. Акрамя таго, неабходна адзначыць, што ва ўсіх разгледжаных намі азначэннях архетып як феномен чалавечай свядомасці звязваецца або з псіхічнымі падсвядомымі працэсамі, або з аб'ектыўнай рэальнасцю, але ніякім чынам не звязваецца з паняційнай моўнай дзейнасцю чала-

века. І гэта не выпадкова. Сам К.Г. Юнг бачыць неразрыўнае адзінства міфалагічнага мыслення і архетыпаў. А міфалагічнае мысленне, як вядома, анталагізіруе славесна-паняційны апарат. «Назва ці адлюстраванне прадмета ці з'явы, – адзначае М. Макоўскі, – успрымалася як штосьці нераздзельнае і рэчыўнае, напрыклад, імя – як рэчыўная частка названага» [8]. Такі пункт гледжання на архетып дазваляе дастаткова адэкватна аналізаваць ролю апошняга ў літаратуры, створанай аўтарамі, якія валодаюць першабытна-міфалагічным мысленнем, аднак пры аналізе іншай літаратуры, яна, на наш погляд, метадычна немэтазгодна. Неабходна перайсці да такога разумення архетыпу, у рамках якога акцэнтуецца яго ўзаемасувязь з моўна-паняційнай дзейнасцю чалавека. Менавіта такога разумення прытрымліваецца Г. Бутырчык. «Пад паняццем «архетып», – адзначае яна, – разумеецца базавая мадэль, узор, абстрактная ідэя, якая змяшчае ў сабе найбольш тыповыя і істотныя характарыстыкі, уласцівыя пэўнаму паняццю» [5, с. 10].

Такім чынам, архетып, калі яго разумець як мадэль, набывае эпістэмалагічныя рысы, не ўласцівыя архетыпу як стваральнай сістэме вобразаў. Неабходна адзначыць, што ў сучаснай літаратуры знаходзяць шырокае прымяненне архетыпы абодвух тыпаў. З аднаго боку, у ёй шырока выкарыстоўваюцца архетыпы, звязаныя з традыцыйнай міфалогіяй. Як адзначае Я. Меляцінскі: «У літаратуры XX стагоддзя з'яўляецца сапраўдная плынь «рэміфалагізацыі», якая захваціла паэзію (Йетч, Паунд і інш.), драму (Кладэль, Кокто, О'Ніл і інш.) і раман (Т. Ман, Дж. Джойс, Г. Брох, Дж. Апдайк, Дж. Лоўрэнс, А. Карпенцьер, М. Астурнас, Х.М. Аргедас, Г.Г. Маркес, М. Булгакаў)» [4, с. 41–42]. З другога боку, у літаратурных творах з'яўляюцца новыя архетыпы, менавіта архетыпы-мадэлі, не звязаныя (ва ўсякім разе ў яўнай форме) з традыцыйнай міфалогіяй, але якія могуць быць прадуктам асабістай міфатворчасці пісьменнікаў. Менавіта да такога роду архетыпаў і адносіцца архетып беларуса, які з'яўляецца прадметам нашага даследавання.

Сказанае, безумоўна, не азначае, што архетыпы ў беларускай літаратуры з'яўляюцца прадуктам толькі самастойнай творчасці пісьменнікаў, напрыклад, іх міфатворчасці, і не звязаны з міфалогіяй беларускага народа. Гэта ўзаемасувязь адчувалася заўсёды, і многія майстры мастацкага слова адкрыта гаварылі аб ёй. Так, напрыклад, паэт Алесь Барскі ў паэме «Блізкасць далёкага» заўважае:

*Без міфаў нельга жыць*
*Не толькі грэкам*
*Таемнае гэта для нас святое* [9].

Чым маладзей нацыянальная літаратура (а сапраўдная літаратура можа быць толькі нацыянальнай), тым бліжэй яна да сваёй першакрыніцы – міфалогіі, выражанай у народным фальклоры. Нямецкі філосаф Ф.В.Й. Шэлінг лічыў, што павінна існаваць некаторая першапачатковая паэзія, якая «папярэднічала б любому выяўленчаму і паэтычнаму мастацтву і, у прыватнасці, выдумляла і нараджала б яго матэрыял. Аднак тое, у чым можна бачыць падобнае пачатковае нараджэнне ідэй, якое папярэднічала б любой свядомай паэзіі, створанай па ўсёй форме, выяўляецца толькі ў міфалогіі» [10]. Менавіта дзякуючы сваім міфалагічным вытокам, лічыў Ф.В.Й. Шэлінг, літаратура і мастацтва ў цэлым дасягаюць сваіх творчых вяршынь. «Сярод прычын, якія надзвычайна спрыялі грэчаскаму мастацтву, – адзначаў нямецкі філосаф, – першай трэба назваць яго ўласцівасці дадзеных перш за ўсё міфалогіяй прадметаў: з аднаго боку, яны належаць вышэйшай гісторыі і іншаму парадку рэчаў, чым тутэйшаму выпадковаму і пераходзячаму, а з другога – знаходзіліся ва ўнутранай сутнаснай і пастаяннай звязанасці з прыродай» [10, с. 364–365].

Узнікшы на базе міфалогіі як «першапачатковай паэзіі», літаратура затым пераходзіць да самаразвіцця, яна становіцца сама для сябе крыніцай. Аднак побач з працэсам аддалення нацыянальнай літаратуры ад сваіх міфалагічных каранёў, ад фальклору адбываецца адначасова і дыялектычна супрацьлеглы працэс звароту, а тым самым набліжэння да гэтых каранёў. Кожная літаратура набліжаецца і аддаляецца ад фальклору неаднолькавымі тэмпамі і па законах розных акалічнасцяў, якія залежаць ад узроўню грамадска-культурнага развіцця. Аднак усюды ў гэтым працэсе набліжэння – аддалення можна заўважыць вяртанне да міфалогіі, якая прадстаўляе сабой не толькі мастацтва слова, але і ўвасабленне першабытна-абшчыннага вопыту, узаемаадносін першабытнага чалавека з сацыяльнай рэчаіснасцю, прыродай, дабром і злом, жыццём і смерцю.

Сучасная беларуская літаратура таксама адчувае неабходнасць звароту да міфалогіі, народнага фальклору. Гэта патрэбна для стварэння мадэлі (гэта значыць архетыпу) тых вобразных структур, у якіх выражана ідэя адраджэння Беларусі і беларускага народа. Паэты і празаікі ўсё часцей звяртаюцца да мінулых часоў у пошуках формулы, мадэлі гістарычнага шляху насельніцтва беларускіх земляў, каб знайсці тлумачэнне сучаснай карціны, каб аднавіць архетып беларуса, надаць яму жыццяздольнасць. Так робяць беластоцкія пісьменнікі С. Яновіч, Я. Чыквін, А. Барскі, М. Лукша, Н. Артымовіч і іншыя, якія ствараюць правобразы, якія захапляюць і заваёўваюць чытача, падымаюць усё забытае традыцыйнае з часавасці ў сферу вечнасці. Творчая ўнутраная туга, незадаволенасць сучаснасцю прымушае гэтых мастакоў шукаць недзе ў неўсвядомленым той архетып беларуса, якому будзе пад сілу расплюшчыць вочы і адчыніць сэрцы тых, хто саромеецца годна назваць сябе беларусам.

Асабліва важным, на наш погляд, зварот да народнай міфалогіі, пошук у ёй паэтычных архетыпаў. Справа ў тым, што менавіта ў гэтых архетыпах адлюстраваны тыя элементы быцця, якія звязваюць чалавека з вечнасцю, звязваюць асобнага чалавека і асобны народ з усім чалавецтвам. Нездарма сам К.Г. Юнг выводзіў феномен універсальнасці асноўных архетыпаў у гісторыі культуры, якія з'яўляюцца, напрыклад, у матывах дзяцінства, мацярынства, мудрай старасці і гэтак далей, з адзінства чалавечай псіхікі на глыбінным узроўні «калектыўнага неўсвядомленага» – гэта значыць першабытнай памяці чалавецтва. І сіла ўздзеяння мастацтва, адпаведна яго пункту гледжання, складаецца з актуалізацыі гэтага глыбіннага ўзроўню ў накірунку да вечнага і агульначалавечага архетыпу.

Паэзія, злучаная з дапамогай такіх архетыпаў з вечнасцю, выходзіць на вяршыню свайго існавання. «Мастацкае тварэнне тым вышэй, – адзначае Ф.В.Й. Шэлінг, – чым больш стварае яно адначасова ўражанне вядомай неабходнасці свайго існавання, але толькі вечны і неабходны змест здымае ў нечым выпадковасць тварэння» [10, с. 365]. Гэты «вечны і неабходны змест», лічыць нямецкі філосаф, само па сабе валодае паэтычным патэнцыялам. Разрыў ніткі, якая звязвае паэзію з дадзеным зместам, па сутнасці абазначае гібель паэзіі, як неабходнасці прывядзення яе да ўзроўню выпадковасці. «Чым больш знікаюць прадметы, якія былі б паэтычнымі самі па сабе, – адзначае Ф.В.Й. Шэлінг, – тым больш выпадковай становіцца сама паэзія; не ўсведамляючы сваёй неабходнасці, яна тым больш імкнецца ўтаіць сваю выпадковасць у бясконцасці вытворчасці і надаць сабе бачнасць неабходнасці» [10. с. 365].

Такім чынам, важнейшай функцыяй архетыпаў у мастацкай літаратуры з'яўляецца злучэнне твораў апошняй з вечнасцю, пераадольванне імі статуса выпадковасці і набыццё неабходнасці. К.Г. Юнг лічыў, што на практыцы выпадковасць у чалавечых паводзінах звязана з індывідуальнымі нетыповымі ўмовамі, а неабходнасць – з тыповымі. Калі чалавек сустракае тыповую сітуа-

цыю, ён раптоўна адчувае ці цалкам выключае вызваленне ці яго агортвае неадольная сіла. У гэты момант чалавек ужо не індывідуальная істота, ён – увасабленне роду, голас усяго чалавецтва прачынаецца ў ім. Менавіта такім чынам швейцарскім вучоным была апісана сітуацыя далучэння чалавека да міфалагічных архетыпаў, якая характарызуецца асаблівай эмацыянальнай інтэнсіўнасцю: «быццам у нас закрануты ніколі раней не звінеўшыя струны, пра існаванне якіх мы зусім не падазраваем» [1, с. 117]. Такім чынам, адпаведна К.Г. Юнгу, асобны сацыяльна атамізіраваны індывід не здольны да сапраўднай творчасці. Ён не можа поўнасцю разгарнуць свае сілы, калі не прыйдзе яму на дапамогу ідэал, утвораны калектыўнымі ўяўленнямі. Усе найбольш распаўсюджаныя ідэалы заўсёды ёсць больш ці менш праўдападобныя, шчырыя варыянты архетыпу. Любы архетып «закранае» нас, абуджае ў кожным з нас голас больш гучны, чым нам уласцівы. У гэтым феномене якраз і заключаецца, на думку К.Г. Юнга, вялікая «тайна ўздзеяння мастацтва».

Будучы мадэллю, усякі архетып выконвае таксама і гнасеалагічную функцыю. Уласна кажучы, усякая мадэль і ствараецца для таго, каб з яе дапамогай пазнаваць свет. «Пад мадэллю, – адзначаў В.А. Штоф, – маецца на ўвазе такая ўяўная ці матэрыяльна рэалізаваная сістэма, якая адлюстроўваючы ці ўзнаўляючы аб'ект даследавання, здольная замяшчаць яго так, што яе вывучэнне дае нам новую інфармацыю аб гэтым аб'екце» [11]. Як мы бачым, у дадзеным азначэнні адзначаецца факт свядомай пабудовы чалавекам нейкага аб'екта, які ён будзе выкарыстоўваць у якасці мадэлі. Аднак архетып з'яўляецца мадэллю асобнага роду. Яго генезіс, лічыў К.Г. Юнг, звязаны з неўсвядомленым. Архетып уласцівы роду і ім атрымліваецца ў спадчыну. У якасці ўмяшчальні («душэўнай прасторы») для архетыпу навукоўца пастуліраваў асабліва глыбокі ўзровень неўсвядомленага, якое выходзіць за межы асобы, – так званае калектыўнае неўсвядомленае. Такая спецыфіка ўзнікнення архетыпу як мадэлі парараджае і асаблівасці выканання ім сваёй гнасеалагічнай функцыі. Архетып не адлюстроўвае нейкі арыгінал, мадэллю якога з'яўляецца, а нараджае пэўны тып аб'ектаў. Менавіта ў гэтай злучанасці архетыпу з тыповым бачыў нямецкі літаратар Т. Ман міфалагічнасць архетыпу: «... у тыповым, – пісаў ён, – заўсёды ёсць шмат міфалагічнага, міфалагічнага ў тым, што тыповае, як і ўсякі міф, – гэта першапачатковы ўзор, першапачатковая форма жыцця, якая невыразна імкнецца ізноў авалодаць вызначальнымі некалі ёй прыкметамі» [12].

У адносінах да літаратурнай творчасці можна сцвярджаць, што архетып як мадэль не з'яўляецца мастацкім вобразам сам па сабе, ён – творчы пачатак, энтылехія гэтых вобразаў. На наш погляд, у гэтым выпадку архетып і вобразы ўступаюць у працэс нейкіх зносін, адно абумоўлівае другое. Строга захоўваючы сваю раздзельнасць, яны ўтвараюць сапраўды ўнутранае адзінства, якое можна апісаць наступнымі словамі: яно, як адзначыў рускі філосаф С.Л. Франк, ёсць «...глыбока ўнутранае, якое пранікае да самых каранёў, сапраўднае адзінства: «узаемадзеянне» ажыццяўляецца тут у форме ўзаемапранікнення. Быццё аднаго з другім, дзеянне аднаго на другое ёсць тут быццё аднаго для другога, а гэта быццё аднаго-для-другога ёсць тым самым – нягледзячы на раздзельнасць – быццё аднаго-у-другім» [13]. Такім чынам, архетып як мадэль у працэсе літаратурнай творчасці перарастае сябе (бо ў мадэліраванні няма разгледжанага намі ўзаемапранікнення вобраза і правобраза) і набывае іншыя якасныя рысы. Канцэпцыя архетыпу арыентуе даследаванне міфаў на пошукі ў этнічнай і тыповай разнастайнасці міфалагічных сюжэтаў і матываў інварыянтнага архетыпічнага ядра, якія метафарычна выяўляюцца гэтымі сюжэтамі і матывамі, але ніколі не могуць быць вычарпальнымі ні паэтычным апісаннем, ні навуковым тлумачэннем. У адносінах жа да аналізу твораў мастацкай літаратуры, дадзеная канцэпцыя накіроўвае літаратуразнаўцаў на пошук у творах пісьменнікаў той пачатковай мадэлі, таго канкрэтнага

«архе», з дапамогай якога аўтар стварае вобразы сваіх літаратурных герояў. Так, напрыклад, у адносінах да аналізу архетыпу беларуса ў творах беластоцкіх літаратараў другой паловы XX стагоддзя наша задача заключаецца не проста ў пераліку тых тыповых рыс беларусаў, якія характэрны для паэтычных герояў дадзеных аўтараў, але пошук менавіта тых асноўных жыватворных і вобразастваральных рыс, якія і будуць у сваёй сукупнасці складаць архетып беларуса.

Рашэнне дадзенай праблемы ўскладняецца некаторымі асаблівасцямі развіцця як беларускай літаратуры, так і сацыяльна-філасофскай думкай у Беларусі. Справа ў тым, што «архе» як стваральны пачатак, як мадэль, узнікае двума асноўнымі спосабамі. Першы апісаны ў «Літаратурным энцыкпапедычным слоўніку», у якім даецца наступнае азначэнне паняцця архетыпу: гэта – «матывы і іх камбінацыі, якія маюць уласцівасць «усюдыіснасці», універсальныя ўстойлівыя псіхалагічныя схемы (фігуры), што неўсвядомлена ўзнаўляюцца і знаходзяць змест у архаічным рытуале, міфе, сімвале, вераваннях, актах псіхалагічнай дзейнасці (снах і гэтак далей) і таксама ў мастацкай творчасці амаль да сучаснасці» [14].

Другі спосаб – гэта спосаб па-філасофску абдуманага стварэння архетыпу. Тут мы можам спасылацца на грэчаскага філосафа Платона. Яго ідэі можна разглядаць у якасці спецыфічных архетыпаў, якія ствараюць «свет рэчаў». У адносінах да мастацкай літаратуры роль гэтых зыходных ідэй належыць сацыяльна-філасофскім канцэпцыям, у якіх выражаны некаторыя асноўныя нуклеарныя рысы фрагментаў рэчаіснасці. Для мэт нашага даследавання асабліва значныя тыя канцэпцыі, у якіх адлюстроўваюцца рысы паняцця «беларус». Неабходна адзначыць, што калі ў суседніх народаў – палякаў і рускіх – такія рысы з дастатковай ступенню пэўнасці выражаны ў філасофскіх паняццях, то ў беларускай філасофскай думцы, на жаль, нічога падобнага на азначэнне паняцця «беларус» не існуе. І справа тут не ў тым, што ў беларусаў увогуле не было прадстаўнікоў філасофскай думкі. Яны былі, але не іх віна, а бяда, што ў рамках тых канкрэтна-гістарычных умоў, у якіх ім прыходзілася тварыць, прамое філасофскае абгрунтаванне ідэй незалежнай Беларусі, канцэптуальнае разуменне сэнсу існавання беларускага народа было немагчыма. Такія ідэі падаўляліся ў зародку як у Рэчы Паспалітай, так і ў Расіі. Такім чынам, беларускія пісьменнікі, ствараючы архетып «беларускага чалавека», вымушаны былі ці ўвогуле абыходзіцца без глыбока распрацаваных філасофскіх ідэй, ці ствараць іх самастойна. Адной з аб'ектыўных прычын, якую адзначаюць многія даследчыкі выключнай філасафічнасці беларускай мастацкай літаратуры, якраз і з'яўляецца неразвітасць прафесійнай філасофскай думкі ў Беларусі: пісьменнікі і паэты такім чынам вымушаны былі браць на сябе функцыі філосафаў. У выніку становіцца надзвычай складаным вывесці той агульны існасны архетып беларуса, які прысутнічае ў беларускай літаратуры. І калі ў рускай літаратуры аналагічны архетып «рускага чалавека» быў як бы першапачаткова зададзены ўсёй ідэалагічнай сістэмай імператарскай Расіі, то для Беларусі такога ідэалагічнага імператыву не існавала ўвогуле або ён поўнасцю супадаў з імператывам рускасці: як вядома, у імператарскай Расіі такой нацыянальнасці як «беларусы» не існавала, а беларусы лічыліся часткай адзінага рускага народа нараўне з велікаросамі і маларосамі (украінцамі). Такім чынам, у існуючым вакууме ідэй беларуская літаратура была вымушана аб'ектыўна займацца не зусім натуральнай для мастацкай літаратуры дзейнасцю, якая насіла філасофска-ідэалагічны характар.

Безумоўна, плённасць гэтай дзейнасці залежала ад глыбіні ўкаранёнасці пісьменніка ў некаторы аб'ектыўна існуючы «беларускі пачатак». Аднак неабходна адзначыць, што ў большасці беларусаў у XX стагоддзі гэты пачатак не ўсведамляўся як штосьці такое, што спецыфічным чынам выдзяляе іх з ася-

роддзя іншых народаў. Неспрыяльная грамадска-палітычная сітуацыя ў пачатку XX стагоддзя вызначала нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Аб гэтым неаднаразова ўпаміналі беларускія пісьменнікі, такія, як Я. Купала, М. Гарэцкі, М. Багдановіч і іншыя. Упаміналі з пачуццём горычы, бо былі заўзятымі прыхільнікамі незалежнасці Беларусі. Больш таго, у многіх іншых людзей існавала некаторае негатыўнае адчуванне сваёй нацыянальнай самасці, пэўная закамплексаванасць: беларусы – гэта людзі, якім вечна наканавана быць у рабстве. «Паказчым прыкладам таго, – заўважае Лявон Вашко,– можа служыць патлумачэнне Іванам Насовічам у сваім «Словаре белорусского наречия» слова хам; Іван Насовіч звяртае ўвагу на тое, што згаданае слова ўжываецца сярод беларускіх людзей у значэнні раб, пры гэтым у народзе існуе вызначэнне-забабон паводле спрадвечнай, наканаванай богам беларускай хамарабскай прыродзе» [15].

Гістарычна склалася так, што беларусы як бы забылі сваё найменне і сталі проста «тутэйшымі». Гэтыя людзі жылі як бы ў іншым гістарычным вымярэнні, у той гісторыі, у якой яны нічым асабліва сябе не праяўлялі. ««Тутэйшы», – працягвае Л. Вашко, – псіхалагічна жыве ў навакольнай гісторыі гэтай сваёй гістарычнай адсутнасцю; ён як бы загадзя прызнае сябе «хамам», не імкнучыся самавыявіцца ў нейкі іншы, дзейсны спосаб; гэтая «прысутная адсутнасць» дужа хвалюе этнографаў. І беларуская мастацкая літаратура пачатку XX стагоддзя спрабуе выявіць «ніштo» як сутнасную, нацыянальную адметку «тутэйшых» [15, с. 81].

Безумоўна, што ў наступныя часы становішча ў многім змянілася ў лепшы бок. Людзі ўжо даўно не называюць сябе «тутэйшымі», а адпаведна з апошнім перапісам большасць беларусаў лічаць беларускую мову сваёй роднай. Аднак пачуццё сваёй нацыянальнай годнасці і самадастатковасці ў большасці беларусаў развіта не намнога больш у параўнанні з канцом XIX – пачатку XX стагоддзя. Адпаведна, тое, што не самавызначана ці вызначана ў нязначнай ступені, не можа валодаць жыццестваральнай сілай, тым самым «архе», аб якім ідзе размова. Такім чынам, сучасныя беларускія пісьменнікі, як і іх папярэднікі канца XIX – пачатку XX стагоддзя, для выяўлення архетыпу беларуса вымушаны абапірацца не на тыя элементы яго, якія слаба захаваліся ў народным калектыўным неўсвядомленым, аісці ў глыбіню стагоддзяў, у тыя часы станаўлення дадзенага архетыпу, які знайшоў сваё адэкватнае адлюстраванне ў народнай міфалагічнай творчасці, у гісторыі. Беларускія паэты-адраджэнцы з вялікаю пашанаю ставіліся да гістарычнай спадчыны свайго народа, разумелі гісторыю як неад'емную частку духоўнай культуры нацыі, як падмурак у працэсе развіцця нацыянальнай свядомасці. Адчуваючы гэта, пісьменнікі не толькі самі звярталіся да дадзеных вытокаў сваёй творчасці, але і заклікалі ісці гэтым жа шляхам маладую беларускую інтэлігенцыю. Так, напрыклад, герой апавядання М. Гарэцкага, вясковы дзед Яхім, такімі словамі настаўляе студэнта-медыка Архіпа Лінкевіча: «Першае, што скажу я табе, гэта – чытай, галубец, у кніжках і ў разумных людзей пытайся, як жылі даўней нашы тутэйшыя людзі... Споўні гэты загад – у жыцці не ашукаешся, будзеш ведаць, што рабіць трэба. І ніякая, братка, чартоўня, ніякія думы чорныя не змогуць цябе» [16]. Такім чынам, побач з рэальнымі элементамі «беларушчыны», якія існуюць у паводзінах сучаснікаў (аднак, якія існуюць у асноўным не на ідэалагічным, а на псіхалагічным, неўсвядомленым узроўні) беларускія пісьменнікі для аднаўлення архетыпу беларуса вымушаны звяртацца да свайго неўсвядомленага «я», да ўнутранага голасу крыві, да міфалагічных вытокаў, да фальклору, і, менавіта, на базе гэтых трох састаўных кампанентаў адкрываць ідэю Беларусі, беларушчыны, саміх беларусаў.

Аднаўлены такім чынам архетып беларуса якраз і будзе валодаць стваральна-анталагічнай функцыяй у іх літаратурных творах. Беларускія вобразы

ёсць разгортванне ў прасторава-часавым літаратурным канцінуме таго нуклеарнага ядра, зыходнай мадэлі, якая авалодала душой пісьменніка, мадэлі, якая і называецца «архетыпам беларуса».

Адзначым, што ў такім нашым разуменні архетып ні ў якай ступені не з'яўляецца сімвалам, знакам. Справа ў тым, што ў навуцы, дзякуючы працам амерыканскага логіка Ч.С. Пірса, які лічыў, што знак ёсць А, які абазначае В для С, устанавілася наступнае традыцыйнае разуменне знака: «Знак, матэрыяльны прадмет (з'ява, падзея), які выступае ў якасці прадстаўніка некаторага другога прадмета, уласцівасці ці адносін і які выкарыстоўваецца для набыцця, захавання, перапрацоўкі і перадачы паведамленняў (інфармацыі, ведаў)» [17]. Архетып жа беларуса ў творчасці беларускіх пісьменнікаў гэта не знак, які толькі рэпрэзентуе вобразы канкрэтных літаратурных герояў, гэта, менавіта, той прынцып «архе», які нараджае іх.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Мифы народов мира***. Энциклопедия в 2 т. / Гл. ред. ***С.А. Токарев***. – М., 1992. – Т. 2. – 719 с.
2. ***Юнг К.Г.*** Собрание сочинений. – Т. 15. – М., 1992. – 516 с.
3. ***Хюбнер К.*** Истина мифа. – М., 1996.– 374 с.
4. ***Мелетинский Е.М.*** Аналитическая психология и проблема происхождения архетипических сюжетов // Вопросы философии, 1991, № 10. – С. 14–32.
5. ***Бутырчык Г.М.*** У пошуках Бацькаўшчыны: Вопыт тыпалагічнага доследу творчасці Джона Стэйнбека і Кузьмы Чорнага. – Мн., 2003. – 54 с.
6. ***Мархель У.І.*** Прысутнасць былога: Нарысы, артыкулы, эсэ. – Мн., 1997. – 192 с.
7. ***Гніламёдаў У.В.*** Паэтычныя традыцыі і менталітэт // Полымя, 1997, № 11. – С. 324–343.
8. ***Маковский М.М.*** Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках. – М., 1996. – 416 с.
9. ***Барскі А.А.*** Блізкасць далёкага. – Беласток, 1987. – 35 с.
10. ***Шеллинг Ф.В.Й.*** Введение в философию мифологии. Сочинения в 2 т. Перевод с нем. – Т. 2 / Сост. ред. ***А.В. Гулыга***; прим. ***М.И. Левиной, А.В. Михайлова***. – М., 1989. – С. 159–375.
11. ***Штофф В.А.*** Моделирование и философия. – М.-Л., 1966. – 301 с.
12. ***Ман Т.*** Собрание сочинений. – Т. 9. – М., 1960. – С. 439.
13. ***Франк С.Л.*** Сочинения. – М., 1990. – 608 с.
14. ***Литературный энциклопедический словарь*** / Под общей редакцией ***В.М. Кожевникова, П.А. Николаева***. – М., 1987. – 570 с.
15. ***Вашко Л.М.*** Гістарызацыя свядомасці: Беларуская літаратура і беларушчына на пачатку XX стагоддзя. Навуковая публіцыстыка. – Масты – Гародня – Мінск, 1997. – 150 с.
16. ***Гарэцкі М.*** Збор твораў. У 4 т. – Т. 1. Апавяданні / [Аўт. прадм. А. Адамовіч]. – Мн., 1984. – 446 с.
17. ***Философский энциклопедический словарь*** / Редкол.: ***С.С. Аверинцев, Э.А. Араб-Огла, Л.Ф. Ильичев и др.*** – 2 изд. – М., 1989. – 815 с.



## SUMMARY

*The article deals with the problem of archetype in general and Belarusian archetype in particular. Much attention is paid to the wide use of this term in philosophy, psychology, cultural studies and literary criticism.*



*Поступила в редакцию 30.08.2004*